3. Фестываль // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т. 5 : Скамарохі – Яшчур / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1987. – С. 398.

**Крэнь В.М., Старарусава М.М.,** студэнткі

Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

## САЦЫЯЛЬНА-АРЫЕНТАВАНАЕ ВАЛАНЦЁРСТВА СТУДЭНТАЎ ЯК УМОВА ФАРМАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАГА ВОПЫТУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У кожным соцыуме ёсць людзі, для якіх праца на карысць іншых людзей з'яўляецца важным спосабам сувязі і зносін са светам і самім сабой, сродкам самарэалізацыі і самаўдасканалення. Аналіз публікацый у СМІ і эмпірычных фактаў сведчыць пра тое, што ў сучасным беларускім грамадстве назіраецца тэндэнцыя гуманізацыі адносін паміж людзьмі самых розных узроставых і сацыяльных груп. Пэўную ролю ў гэтым адыгрывае добра вядомы культурны феномен, спосаб рэальнай дапамогі і сацыяльнага служэння – валанцёрства. У шырокім сэнсе валанцёрства (voluntarius - у перакладзе з лацінскага азначае добраахвотна) – гэта дзейнасць, якая ажыццяўляецца добраахвотна на карысць людзям, без разліку на грашовае ўзнагароджанне. Папулярызацыя валанцёрства ў цэлым і маладзёжнага ў прыватнасці, выступае магутным грамадскім рэсурсам у паляпшэнні якасці жыцця ўсяго грамадства праз вырашэнне сацыяльных праблем. Міжнародная практыка валанцёрства паказвае, што добраахвотніцтва моладзі - гэта яшчэ і стратэгія пазітыўнага развіцця, якая забяспечвае асобасны рост і самаўдасканаленне моладзі [2].

Мэтай нашага даследавання стала параўнальнае асэнсаванне валанцёрскай дзейнасці як ўмовы фарміравання прафесійнага вопыту будучых спецыялістаў сацыякультурнай дзейнасці і артыстаў эстрады, якія атрымоўваюць адукацыю ў дзённай і завочнай формах навучання. Дадзеная

мэта была абумоўлена працэсамі мадэрнізацыі прафесійнага навучання ў Рэспубліцы Беларусь, якая выклікана патрэбамі краіны ў выпускніках ВНУ з сур'ёзнай практыкаарыентаванай тэарэтычнай падрыхтоўкай, якая ажыццяўляецца па запытах працадаўцаў, у ініцыятыўных і мабільных спецыялістах, здольных да супрацоўніцтва і якаснага вырашэння прафесійных задач. Уцягванне студэнтаў у сацыяльна-арыентаванае добраахвотніцтва, у якім ствараюцца ўмовы для іх самарэалізацыі, як будучых суб'ектаў прафесійнай дзейнасці, актуалізуюць прафесійнае развіццё ўжо непасрэдна ў адукацыйным працэсе. Асноўнымі вынікамі інтэграцыі сацыяльнага валанцёрства ў працэс вывучэння вучэбных дысцыплін – змяненне адносіны да вучобы, развіццё самастойнасці студэнтаў, інтэграцыя тэарэтычных ведаў у іх практычнае прымяненне. Як адзначаюць даследчыкі Макарава І.М., Мазнічэнка М.А., Шашкоў А.У., пры такой інтэграцыі дадаткова назіраюцца: павышэнне паспяховасці студэнтаў; фарміравання ў іх пачуцця асабістай і сацыяльнай адказнасці; рост самаацэнкі і ўпэўненасці ў асабістай паспяховасці [0]; фарміраванне грамадзянскіх навыкаў (пачуцця грамадзянскай адказнасці, ўсведамлення праблем свайго горада, соцыуму).

Для выяўлення зацікаўленасці ў добраахвотніцтве, матываў ўдзелу і найбольш цікавых для іх відаў валанцёрства, было праведзена апытанне студэнтаў 1 курса: 38 чалавек з факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці і столькі ж з факультэта завочнага навучання. Прааналізаўшы вынікі анкет, мы канстатавалі: стаўленне да сацыяльна-арыентаванай бясплатнай працы на добраахвотнай аснове розніцца, так было вызначана, што да яе адмоўна ставяцца 6% студэнтаў ФКСКД і 12% – ФЗН, 19% і 20% – не змаглі адказаць, але 68% завочнікаў і 75% студэнтаў стацыянара – ставяцца да сацыяльна-арыентаванай бясплатнай працы станоўча, і выказваюць цікавасць да валанцёрскай дзейнасці. Пры гэтым яны па рознаму ўспрымаюць сацыяльна-арыентаванае добраахвотніцтва: калі 64% студэнтаў ФКСКД грамадскую валанцёрскую працу разглядаюць як магчымасць прынесці людзям карысць, а 14% як варыянт удзелу ў грамадскім жыцці свайго рэгіёну,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

то сярод студэнтаў ФЗН гэтыя варыянты адказаў выбралі адпаведна 38% і 60%. Мы мяркуем што гэта тэндэнцыя абумоўлена “сувяззю” з рэгіёнам, якая ў студэнтаў дзённай формы навучання значна слабейшая у параўнанні з студэнтамі завочнай формы навучання, якія працягваюць працаваць на сваёй малой радзіме. Таму магчыма няма сярод завочнікаў тых, хто разглядае валанцёрства, як дзейнасць, якой можна заняцца калі шмат вольнага часу і трэба некуды скіраваць сваю актыўнасць, (а на ФКСКД 7% апытаных). Патэнцыяльна прывабнымі відамі грамадска-карыснай дзейнасці, якімі хацелі б займацца першакурснікі ФКСКД, з'яўляюцца: сацыяльна-культурныя праекты – 48%, сацыяльнае валанцёрства па дапамозе дзецям-сіротам і інвалідам – 28%, клопат і догляд бяздомных жывёл – 10%, донарства – 6%, сярод будучых артыстаў эстрады больш прывабны мастацка-музычныя праекты (40%), дабрачынныя канцэрты (32%), тэлевізійныя конкурсы з удзелам дзяцей-сірот і інвалідаў (20%). Бонусамі для добраахвотнікаў з‘яўляюцца: незабыўны опыт працы на грандыёзных мерапрыемствах; знаёмства з новымі і цікавымі людзьмі; магчымасць праявіць сябе перад патэнцыяльнымі працадаўцамі; атрыманне лістоў падзякі, якімі можна папоўніць асабістае партфоліо.

Сярод прычын, якія перашкаджаюць далучэнню моладзі да валанцёрскай дзейнасці, студэнты завочнага навучання выбралі “недастатковае інфармацыйнае суправаджэнне добраахвотных ініцыятыў на месцах”, і “адсутнасць сфарміраваных валанцёрскіх суполак ці фарміраванняў”, а дзённага – толькі першы варыянт. Тлумачэннем гэтаму з‘яўляецца знаёмства ўсіх першакурснікаў ФКСКД з дзейнасцю валанцёрскага клуба “ЕЛОН” БДУКМ, лічым мэтазгодным пашырыць дадзеную практыку і на увесь ФЗН (пакуль толькі на адной спецыяльнасці). Выніковы аналіз апытання студэнтаў-валанцёраў абодвух факультэтаў і іх валанцёрскай практыкі паказаў, што арганізацыя і ўдзел у сацыяльна-арыентаванай добраахвотнай дзейнасці падчас навучання спрыяе развіццю творчага патэнцыялу, гнуткасці і нарматыўнасці паводзін, узрастанню патрэбы маладых людзей у самаразвіцці і самаўдасканаленні. Студэнты уцягнутыя у дзейнасць валанцёрскага клуба ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсе індывідуальнай альбо групавой работы, пашыраюць «поле душэўнага жыцця» (А.А.Ухтомский), вучацца быць карыснымі людзям. У выніку ў іх фармуецца ўнутраная патрэба ў клопаце і дапамозе. Паступова валанцёры знаёмяцца з разнастайнымі формамі і ўцягваюцца ў працу з рознымі катэгорыямі насельніцтва, пачынаюць самастойна рыхтаваць і праводзіць акцыі міласэрнасці, удзельнічаць у гарадскіх і краявых канцэртах, конкурсах, святах і флэшмобах, – прафесійна праяўляцца як спецыялісты сацыяльна-культурнай дзейнасці і артысты эстрады.

Умовамі паспяховага далейшага фармавання прафесійнага вопыту праз сацыяльна-арыентаванае валанцёрства можа стаць прынятая варыятыўная адукацыйная палітыка, пры якой кожнаму студэнту прадстаўлены выбар:

- прайсці вучэбную або вытворчую практыку традыцыйна ці праз удзел у канкрэтным валанцёрскім праекце;

- выканаць курсавую работу/праект, выпускную кваліфікацыйную работу традыцыйна альбо ў форме распрацоўкі, рэалізацыі і навуковага апісання рэалізаванага сацыяльна-арыентаванага валанцёрскага праекта;

- здаць залік/экзамен па дысцыпліне ў форме вуснага адказу або ў форме абароны выкананага валанцёрскага праекта, звязанага з дысцыплінай.

- распрацоўка і рэалізацыя міні-валанцёрскіх праектаў на практычных і лабараторных занятках па дысцыпліне;

- распрацоўка і рэалізацыя валанцёрскіх праектаў у якасці задання для самастойнай і навукова-даследчай працы [3].

Інтэграцыя валанцёрскай дзейнасці ў працэс вывучэння навучальных дысцыплін можа ажыццяўляцца з выкарыстаннем тэхналогій:

- тэхналогія «разумнага валанцёрства»;

- індывідуальнае і групавое праектаванне;

- мадэляванне;

- прэзентацыі выкананых валанцёрскіх праектаў і інш.

При гэтым трэба даць магчымасць усім студэнтам паспрабаваць сябе ў выкананні новых для іх функцый, авалоданне якімі дазволіць здзейсніць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійны рост, развіць якасці, якія адсутнічаюць, таму што калі прадастаўляць валанцёрам магчымасць паспрабаваць сябе ў розных відах добраахвотніцкай дзейнасці, нават тых, для якіх у іх не хапае пэўных уменняў і якасцяў, з‘яўляецца матывацыя іх развіваць. Пры арганізацыі сацыяльна-арыентаванага валанцёрства навучанне па загадзя распрацаванай праграме замяняць навучаннем, якое зыходзіць з патрэб праекта і саміх студэнтаў-валанцёраў, каб вучыць фарміраваць свае адукацыйныя патрэбы і рэалізоўваць іх. Не гледзячы на тое, што інтэграцыя валанцёрства ў пазавучэбную дзейнасць студэнтаў, у параўнанні з інтэграцыяй яго ў вычэбны працэс, стварае больш шырокае поле для праявы добраахвотніцкай актыўнасці будучых прафесіяналаў, дае магчымасць выбару відаў і форм валанцёрскай дзейнасці, дазваляе ў большай ступені ўлічваць інтарэсы і патрэбы студэнтаў, мы прыйшлі да высновы неабходнасці аб‘яднання усіх відаў дзейнасці ва універсітэце з мэтай фарміравання неабходнага прафесійнага вопыту студэнтаў усіх форм навучання.

---


1. Бородаева, Г.Г. Волонтерская деятельность как фактор формирования личности студента / Г.Г. Бородаева, И.А. Руднева // Научное обозрение. Педагогические науки. – 2015. – № 1. – С. 89-89.

2. Европейская волонтерская служба (EVS) [Электроный ресурс]. – Режим доступа: https://interrasibir.com

3. Интеграция волонтерской деятельности в учебную и внеучебную работу вуза / И.Н. Макарова, М.А. Мазниченко, А.В. Шашков // Олимпийское наследие и крупномасштабные мероприятия: материалы VIII международной научно-практической конференции. – Сочинский государственный университет, 2016. – С. 106-119.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ